■ Кантрамарка

# Тэатр выходзіць на прастору

**«А тое, што ў вас на стале кнігі Леніна і Сталіна ляжаць, — гэта свядомае рашэнне ці выпадковасць?» — пытаецца ў рэжысёра Алены Сілуцінай крытык Таццяна Арцімовіч. Некаму пытанне падаецца дробязным, аднак насамрэч значэнне мае ўсё: і пасведчанне ўзнагароджанага пасмяротна капітана па правую руку, і прыстасаванне для штампоўкі фальшывых акцызаў па левую, і некалькі кніг са зборам твораў непасрэдна перад вачыма. Тэатр выходзіць за межы сцэны, пераўтвараючы рэальнасць у дэкарацыю. У Мінску зладзілі чытанні п'ес у музеі, школьным двары і камп'ютарным клубе.**



Фота Вікторыі БЕЛЯКОВАЙ.

## ВЫЙШЛІ З ЗАЛЫ

Вы выпраўляецеся ў тэатр, а трапляеце на закінуты завод. Ідзяце паглядзець спектакль, аднак надзяваеце навушнікі і разглядаеце помнікі на магілах. Жанр site-specific, калі тэатральнае дзеянне пакідае звыклую прастору і выходзіць куды заўгодна, набірае ўсё большую папулярнасць у свеце. Беларуская тэатральная прастора такімі эксперыментамі гледачоў пакуль што не надта песціць — падобныя спектаклі можна пералічыць па пальцах. Паўплываць на становішча і вывесці тэатр у іншыя прасторы вырашылі Цэнтр беларускай драматургіі і Цэнтр сучасных мастацтваў, арганізаваўшы праект «Драма Live». У межах гэтага праекта з красавіка па чэрвень тры п'есы сучасных беларускіх драматургаў былі прачытаны па-за межамі тэатральнай залы.

## ЦІ ЧЫТАЮЦЬ МІЛІЦЫЯНЕРЫ МАРКЕСА?

На гэтае ды іншыя светапоглядныя, а часам і правакацыйныя пытанні паспрабаваў знайсці адказ драматург Віталь Каралёў у сваім тэксце «Участковыя, ці Перааддольваючы супрацьдзеянне». Рэжысёр Алена Сілуціна сумесна з Цэнтрам беларускай драматургіі яшчэ да правядзення «Драма Live» зладзілі некалькі чытанняў «Участковых...» у прасторы звычайнай жылой кватэры аднаго з дамоў слыннай Асмалоўкі. Аднак для чытання ў межах праекта была выбрана іншая лакацыя — Цэнтральны музей унутраных войскаў МУС Рэспублікі Беларусь. Сярод экспазіцыі зброі, забранай у зламыснікаў; фотаздымкаў з месца злачынства; пратаколаў ды іншых цікавых у сваёй жахлівасці прадметаў перад гледачамі разгарнулася драма двух участковых інспектараў.



Ніводная школа, у якую звярталіся арганізатары праекта, не пагадзілася прадаставіць памяшканне для чытання п'есы Аляксея Макейчыка «Сорам» (рэжысёр Аляксандр Марчанка). Магчыма, прычынай таму стала вострая сацыяльнасць тэксту, дзе вобраз настаўніка не выключна станоўчы, а праблемы вучняў часам вырашаюцца з дапамогай Крымінальнага кодэксу. Зазначу, што чытаць п'есу збіраліся не вучням, а аўдыторыі 18+. Чытанне ўрэшце арганізавалі ў імправізаваным класе на адкрытым паветры — гледачоў рассадзілі за парты на ўнутраным дворыку Цэнтра сучасных мастацтваў.

Дзеянне п'есы Андрэя Іванова «Гэта ўсё яна» (рэжысёр Андрэй Іваноў) разгортваецца ў двух паралельных сусветах. Рэальным, дзе маці і сын-падлетак не могуць знайсці агульнай мовы пасля таго, як трагічна пайшоў з жыцця бацька. І віртуальным, дзе маці прымярае на сябе маску дзяўчыны-школьніцы і наладжвае камунікацыю праз сацыяльныя сеткі. Прачыталі гэтую п'есу ў інтэрнэт-клубе Devilmice.

## НЯМА ЧАГО ПАВЕДАМЛЯЦЬ — АДЧУВАЙЦЕ

Пра што думаецца пасля квэсту па трох чытаннях? За асваеннем новай прасторы прыхавана вельмі важная тэндэнцыя сучаснага тэатральнага працэсу: тэатр выходзіць з зоны пасылу, бо не можа паведаміць нам нешта новае, такое, чаго б мы не ведалі. Тэатр не імкнецца расказаць гісторыю пра тое, як належыць пражыць жыццё, але імкнецца прымусіць нас нешта адчуць і перажыць. Дэзарыентуе нас у межах мастацтва і рэальнага жыцця, калі мы, напрыклад, намагаемся зразумець: стос кніг з творамі Леніна — мастацкае рашэнне ці выпадковасць? Гэта насамрэч вельмі важна, і не столькі з-за выніку, колькі з-за працэсу пошуку мяжы рэальнасці. Працэс перажывання гэтай дэзарыентацыі гледачамі сёння і ёсць адна з мэтаў стваральнікаў спектакля.

Сучасны тэатр шмат працуе з нашым падсвядомым. Пэўная арганізацыя прасторы і дзеяння мусіць выцягнуць камплект унікальных асацыяцый са свядомасці і падсвядомасці кожнага гледача. Дарослы чалавек садзіцца за парту, каб паслухаць п'есу, але гэтае дзеянне выклікае ў ім значна больш асабістых успамінаў і асацыяцый, чым першапачаткова закладалі стваральнікі спектакля. Так большасць з нас сніць кашмары пра здачу экзаменаў, аднак у кожнага гэта свой сон. Узнікненне падчас прагляду спектакля гэтага «эфекту свайго сну» і дабіваецца ад гледача сучасны тэатр.

Першы «Драма Live» (арганізатары абяцаюць працягваць чытанні ў межах праекта і ў наступным тэатральным сезоне) асвойваў досыць ізаляваныя прасторы: музей, унутраны дворык, пакой інтэрнэт-клуба. Ідэя з чыткай п'есы Паўла Пражко «Карына і Дрон» у адным з гандлёвых цэнтраў, на жаль, засталася нерэалізаванай (гэты прыклад і вышэй згаданы са школьным памяшканнем, дарэчы, дэманструюць, як цяжка бывае сёння тэатру дамагчыся сутыкнення з рэальнасцю ў любой ступені). Аднак ступень сутыкнення тэатра і рэальнасці — адно з самых важных пытанняў сучаснага тэатральнага працэсу. На мой погляд, вектар развіцця «Драма Live» заўважны: гэта паэтапныя крокі да ўзроўню суіснавання з рэальнасцю, які, напрыклад, узорна дэманструе ў сваім праекце «Remote X» (дзе X — гэта назва горада, у якім ствараюць спектакль) нямецка-швейцарская тэатральная група Rimini Protokoll. «Remote X» створаны ўжо больш як у дзясятку гарадоў розных краін (у тым ліку ў Маскве і Санкт-Пецярбургу). Група людзей у навушніках выходзіць на сапраўдныя гарадскія вуліцы, дзе адбываецца штодзённае гарадское жыццё. Гледачы і адначасова ўдзельнікі спектакля, якіх вядзе штучны голас з навушнікаў, пачынаюць асвойваць гарадскую прастору і выконваць пэўныя дзеянні, падобныя да флэшмобаў (танцы на вуліцах, акцыя пратэсту супраць невядома чаго з выпадковымі прадметамі ў руках), тым самым правакуючы рэакцыю гарадской прасторы і гараджан на свае дзеянні.

Праект «Драма Live», нягледзячы на пэўныя недахопы ўзаемадзеяння тэксту, тэатральнага дзеяння і прасторы (што дапушчальна для эксперыментальнай працы, якая найперш арыентаваная на спасціжэнне працэсу, тэхналогіі, спосабу), здаецца мне адной з самых знакавых падзей тэатральнага сезона 2014/2015 (аднак пакуль што без прэтэнзіі на праграмнае выказванне ці маніфест), бо зусім па-новаму асэнсоўвае катэгорыю прасторы ў тэатры. І дае магчымасць кожнаму гледачу асэнсаваць сваю новую ролю ў тэатры.

**Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ.**
*malcheuskaya@zviazda.by*

---

*Крынічка*

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# КВЕТКІ ЧЭРВЕНЯ

**Ідзе выдатны летні месяц, які не саступае папярэдняму маю па прыгажосці квітнеючых у ім раслін.**

## ГВАЗДЗІК БАРАДАТЫ, АБО ТУРЭЦКІ



Вельмі папулярны гваздзік для розных тыпаў кветнікаў. Кветкі доўга стаяць у зрэзцы.

Гваздзік барадаты — двухгадовая расліна, якая часта вырошчваецца як шматгадовая, вышынёй да 70 см. Кветкі дробныя, духмяныя, пурпурна-чырвоныя, аранжава-ружовыя, белыя, сабраны ў парасоны дыяметрам 8-12 см, распускаюцца ў маі-чэрвені і цвітуць працягла. Ёсць мноства сартоў, якія адрозніваюцца па афарбоўцы кветак.

• ***Асаблівасці вырошчвання.*** Непатрабавальная расліна. Святлолюбівая, добра развіваецца і цвіце на ўрадлівых, дрэнажаваных глебах з нейтральнай або слабашчолачнай рэакцыяй, не выносіць пераўвільгатнення.

• ***Гэта цікава.*** Гваздзік у розных народаў — сімвал неадназначны: у італьянцаў — талісман гарачага кахання і абярэг ад няшчасцяў, а ў бельгійцаў — залог утульнага сямейнага ачага і бацькоўскага клопату.

## ЛІЛЕІ



Лілеі — вельмі эфектныя расліны, але яны валодаюць вялікай індывідуальнасцю і ім складана падабраць партнёраў у кветніку. Тым не менш лілеі жаданыя ў кветніках розных тыпаў.

Лілеі — шматгадовыя травяністыя цыбульныя расліны з сямейства лілейных, вышынёй ад 25-30 см і да 1 м і больш. Кветкі рознай афарбоўкі і трубчастай, лейка- і бакалападобнай формы, адзіночныя або ў суквеццях, цвітуць працягла.

• ***Асаблівасці вырошчвання.*** Святлолюбівыя, добра растуць і цвітуць на ўрадлівых, добра дрэнажаваных глебах з дабаўленнем пяску. На адным месцы могуць расці 4-5 гадоў. Часцей за ўсё размнажваюць дзяленнем гнязда цыбулін. Могуць пашкоджвацца цыбульным каранёвым кляшчом, цыбульным лістаедам, лілейнай мухай, тлёй і захварэць на фузарыёз, шэрую гніль, плямістасць.

• ***Гэта цікава.*** Старажытныя грэкі лічылі кветку лілеі ўвасабленнем адзінства жанчыны і мужчыны, таму вянкамі з лілей упрыгожвалі галовы жаніха і нявесты на вясельных цырымоніях.

# ПАЛІЎ І ПАДКОРМКА ТАМАТАЎ

**Больш папулярных агароднінных культур, чым памідоры і агуркі, у працаўнікоў дачнага фронту, мабыць, не знайсці. Штогод у разгар сезона самымі надзённымі пытаннямі зноў становяцца «Як часта паліваць?» І «Як лепш за ўсё падкарміць?», каб ураджай быў усім на дзіва. Нялішне ўсё ўспомніць і раскласці па палічках.**



• ***Паліў***

Большасць агароднікаў старанна паліваюць вадой з шланга ўсе культуры запар, каб як мага больш «выціснуць» з абмежаванага часам вячэрняга паліву «праз два дні на трэці». Ну няправільна ж так! А як правільна? Правільна ведаць, што «любіць» памідор, што яму трэба і ў якім асяроддзі камфортна.

Таматы не любяць ні засухі, ні лішку вады. Самае спрыяльнае спалучэнне для іх — цёпла, суха, але на досыць увільготненай глебе. У народзе кажуць: «Памідоры любяць сухую галаву, але мокрыя ногі». Калі вільгаці недастаткова (па расліне адразу відаць), лісце абвісае, скручваецца, бутоны і завязі могуць абсыпацца. Калі ж вільгаці залішне, таматы пачынаюць хварэць, а недаспелыя плады лопаюцца і чарнеюць.

Важны правільны рэжым паліву. Пасля высадкі ў грунт расаду добра паліваюць і пакідаюць у спакоі на 2-3 дні (можна і даўжэй), затым паліў робяць 1-2 разы на тыдзень багата, але з улікам сорта, памераў і надвор'я. На нізкарослыя маладыя кусты дастаткова будзе па 2-3 літры, тады як на паліў рослых гігантаў спатрэбіцца не менш за 10 л. Часта рэкамендуюць паліваць раз на 5-7 дзён нават у гарачы час. Але тут, як і ўсюды, павінен дзейнічаць прынцып мэтазгоднасці: калі бачым, што лісточкі павіслі — бяром і паліваем!

Паліваць памідоры лепш за ўсё раніцай. Пад корань. Калі вада ўбярэцца, глебу неабходна неглыбока падрыхліць.

Ваду для паліву лепш за ўсё адстаяць і падагрэць. Вельмі добра, калі на ўчастку ёсць бак, які можна пафарбаваць чорнай фарбай, каб вада на сонцы лепш награвалася. Паліваць кусты таматаў зверху, на лісце, ды яшчэ і халоднай вадой са шланга — гэта як мінімум напалову загубіць ураджай.

Ідэальны варыянт — кропельны паліў. Калі ёсць магчымасць яго арганізаваць, тамат толькі скажа вам дзякуй: глеба будзе ўвесь час вільготнай, і ніякая спякота не страшная.

• ***Падкормка***

Тут таксама існуе шмат меркаванняў. Найбольш «хадавыя» версіі:

• 3 разы на працягу дачнага сезона,

• 4 разы за сезон,

• рэгулярна, кожныя 2 тыдні.

Тут вырашаць толькі самому гаспадару ўчастка. Але ёсць пэўныя нормы і асаблівасці, якія трэба ўлічваць.

***Азотныя ўгнаенні*** вельмі моцна стымулююць нарастанне зялёнай масы (сцябла, лісця, пасынкаў), і гэта вядзе да таго, што запавольваецца саспяванне пладоў. Таму набухаць «азоту» ў першую ж падкормку — не самае разумнае рашэнне.

***Фосфарна-калійным угнаенням*** варта аддаць перавагу, калі хочаце атрымаць памідоры з невысокай колькасцю нітратаў.

***З калійных угнаенняў*** самы лепшы варыянт для таматаў — попел або сульфат калію. Хлорысты калій толькі нашкодзіць — хлор дзейнічае на таматы прыгнятальна.

***З мікраўгнаенняў*** самыя важныя для таматаў — магній і бор. Бор асабліва неабходны ў момант цвіцення (заўважалі, што нярэдка кветкі і завязі могуць проста ападаць? Гэта ад недахопу бору. І дастаткова 1-2 разы абпырскаць лісце і кветкі растворам борнай кіслаты ў канцэнтрацыі 1 г на 1 літр вады, каб праблема знікла).

***Арганічныя ўгнаенні.*** Тут лішніх слоў не трэба. Настой птушынага памёту або каравяку і зялёнай травы... Як ужываць арганічныя ўгнаенні, ведаюць, напэўна, усе. Кампостам і перагноем можна замульчыраваць таматы — гэта «два ў адным флаконе»: і гаючая мульча, і ахова ад хвароб. Настоямі арганікі добра рабіць вадкія падкормкі.

***Чатыры рэцэпты падкормкі на ўвесь дачны сезон***

• На 10 л вады 0,5 л вадкага каравяку + 1 ст. лыжка нітрафоскі (па 0,5 л на кожны куст).

• На 10 л вады 0,5 л курынага памёту + 1 ст. лыжка суперфасфату + 1 ч. лыжка сульфату калію (па 0,5—1 л на куст).

• На 10 л вады 1 ст. лыжка гумату калію + 1 ст. лыжка нітрафоскі (5 л на 1 кв.м).

• На 10 л вады 1 ст. лыжка суперфасфату (10 л на 1 кв.м).

Ну і напрыканцы — новы цікавы рэцэпт для падкормкі таматаў.

Кактэйль «Чароўны бальзам»: вядро каравяку, 2 рыдлёўкі попелу, 2 кг дражджэй, 3 л сыроваткі, 4-5 вёдраў зялёнай крапівы.

Усе кампаненты — у 200-літровую бочку, даліць вады, настойваць 2 тыдні.

Спосаб ужывання і дозы: 1 літр кактэйлю пад куст, паліў адзін раз на 7—10 дзён пад корань.

---

*Азбука народнай культуры*

**ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч**

ТАЛІСМАН — звычайна невялікая рэч, зробленая з прыродных матэрыялаў (расліны, дрэва, каменя, золата, серабра, медзі...), а таксама гэтыя матэрыялы, «апрацаваныя» прыродай, напрыклад, невялікі камень з адтулінай («курыны бог»), «перуновы стрэлы» (кавалачкі драўніны, трэскі), якія з'явіліся пасля ўдару маланкі ў дрэва.

◈ Па ўяўленнях нашых продкаў талісман мог максімальна спрыяць яго ўладальніку ў розных жыццёвых сітуацыях, падчас вырашэння складаных праблем, аказваць станоўчы ўплыў на здароўе, гарманізаваць духоўны свет чалавека і яго паўсядзённыя грамадскія адносіны.

◈ Нярэдка талісманы чалавек рабіў сам. Для тых, хто шмат падарожнічаў, надзейным талісманам-памочнікам быў посах ці тэкст замовы, выразаны на паверхні якой-небудзь рэчы ці напісаны на паперы. Відаць, усе жаночыя ўпрыгожанні галавы, вушэй, шыі і рук адначасова выконвалі ролю абярэга, амулета і талісмана, асабліва тады, калі спрактыкаваныя майстры рабілі іх на заказ ад будучага ўладальніка.

◈ Да свяшчэнных талісманаў залічвалі зямлю, узятую з родных мясцін, асабліва ў тым выпадку, калі чалавек ад'язджае надоўга ці назусім.

◈ З цягам часу ролю талісмана пачалі выконваць атрыбуты, якія рыхтавалі да правядзення каляндарных абрадаў. Так, штогод на Грамніцы кожная сям'я выплаўляла свечку-грамніцу, якая на працягу каляндарнага года выконвала ролю сямейнага і гаспадарчага абярэга. Аплаўленыя рэшткі грамніцы не ўплаўлялі ў наступную свечку, а пакідалі і насілі пастаянна пры сабе.

◈ Аналагічную функцыю выконвалі атрыбуты абрадаў сямейна-родавай накіраванасці: засушаная пупавіна дзіцяці, кавалачак вясельнага каравая. З пакалення ў пакаленне перадаваліся пялёнкі, у якія спавівалі дзіця пасля першага рытуальнага купання і падчас хрышчэння; заручальныя пярсцёнкі бацькоў-юбіляраў.

◈ З прыходам хрысціянства кола талісманаў значна пашырылася. Іх ролю сталі выконваць драўляны нацельны крыжык, ладанка, просвірка, свечка, медальёны з выявамі святых, у гонар якіх чалавек атрымаў імя, «святыя пісьмы», імянныя абразкі.

---

Даты | Падзеі | Людзі

### 24 ЧЭРВЕНЯ



**1900** год — у вёсцы Жабчава Капыльскага раёна Мінскай вобласці нарадзіўся Кузьма Чорны (Раманоўскі Мікалай Карлавіч), беларускі пісьменнік. У 1916—1919 гг. вучыўся ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі, у 1923—1925 гг. — у БДУ. Быў членам літаратурнага аб'яднання «Маладняк», старшынёй літаратурнага аб'яднання «Узвышша». У 1938 годзе арыштаваны. Да чэрвеня 1939 года знаходзіўся ў мінскай турме. З 1941-га быў у эвакуацыі ў Маскве, удзельнічаў у выданні газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну». У 1944 годзе вярнуўся ў Мінск, працаваў у часопісе «Беларусь». Аўтар раманаў «Зямля», «Айчына», «Трэцяе пакаленне», аповесцяў «Лявон Бушмар», «Люба Лук'янская», апавяданняў. Выступаў таксама ў жанры драматургіі. Пераклаў на беларускую мову многія творы А. Пушкіна, М. Гогаля, М. Горкага, Я. Гашака і інш. Памёр у 1944 годзе.

**1945** год — у Маскве на Краснай плошчы адбыўся гістарычны Парад Перамогі савецкіх воінаў у гонар перамогі над фашысцкай Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг. У ім прынялі ўдзел зводныя палкі франтоў, Наркамата абароны СССР і ВМФ СССР, ваенных акадэмій, вучылішчаў і часткі Маскоўскага гарнізона. Прымаў парад Маршал Савецкага Саюза Г.К. Жукаў, камандаваў парадам Маршал Савецкага Саюза К.К. Ракасоўскі. Падчас урачыстага маршу па Краснай плошчы наперадзе зводных палкоў усіх франтоў на спецыяльна абсталяваным аўтамабілі правезлі Сцяг Перамогі, які быў устаноўлены 30 красавіка над рэйхстагам. Сярод удзельнікаў параду былі беларусы і ўраджэнцы Беларусі П.Я. Галавачоў, І.І. Гусакоўскі, С.А. Красоўскі, Ф.І. Перхаровіч, І.І. Якубоўскі і інш.

**1990** год — прайшоў апошні канцэрт групы «Кіно» ў Маскве на Вялікай спартыўнай арэне Лужнікоў. На гэтым канцэрце, упершыню пасля маскоўскай Алімпіяды-80 быў запалены агонь у Алімпійскай чашы. Пасля гэтага Віктар Цой з Юрыем Каспаранам адасобіліся на лецішчы пад Юрмалай, дзе пад акустычную гітару пачалі запісваць матэрыял для новага альбома. Гэты альбом, дапісаны і зведзены музыкантамі «Кіно» ўжо пасля смерці Цоя, выйшаў у снежні 1990 года і атрымаў сімвалічную назву «Чорны альбом», з адпаведным афармленнем вокладкі.

**Было сказана**

**Кузьма ЧОРНЫ, празаік, драматург, публіцыст:**

*«Свет не толькі бязлітасны і жорсткі.
Ён яшчэ ласкавы і ясны».*

---

■ Ну і ну!

# Біўні для... асабістага карыстання

**Праз рэспубліканскі пункт мытнага афармлення «Брузгі-2» на тэрыторыю Еўрасаюза ў «Фольксвагене» спрабавалі вывезці прадметы, якія могуць мець культурную каштоўнасць.**

Гаворка ідзе пра 28 біўняў маманта, а таксама рэстаўрацыйны матэрыял — агулам груз важыў 400 кілаграмаў. У легкавым аўтамабілі яго спрабаваў вывезці грамадзянін Германіі, паведамілі падрабязнасці ў прэс-службе Дзяржаўнага мытнага камітэта. Як патлумачыў сам кіроўца, усе гэтыя прадметы ён вёз для асабістай калекцыі і ў яго не было мэты атрымаць камерцыйную выгаду. Зараз Гродзенская рэгіянальная мытня праводзіць праверку па факце законнасці вывазу вышэйназваных тавараў з тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *sr@zviazda.by*

---

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 4.38 | 21.46 | 17.08 |
| Віцебск | — 4.19 | 21.44 | 17.25 |
| Магілёў | — 4.28 | 21.36 | 17.08 |
| Гомель | — 4.34 | 21.23 | 16.49 |
| Гродна | — 4.55 | 21.59 | 17.04 |
| Брэст | — 5.05 | 21.50 | 16.45 |

**Месяц**

***Першая квадра ў 13.02.***
***Месяц у сузор'і Шалі.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Яфрэма.*
***К.*** *Нараджэнне Іаана Хрысціцеля.*



Фота Алесі ВАРАБ'ЁВАЙ.

## ЗАЎТРА





---

УСМІХНЕМСЯ

**— Як даглядаць змей?**
**— Заробак ім своечасова прынасіць...**

У чукоцкай «камасутры» толькі дзве позы: у юрце і за юртай.

**Універсітэт.**
**— Вы стараста? Давайце залікоўкі, хто сёння здаў.**
**— Вось.**
**— Нагадайце, які курс?**
**— Па курсе Нацбанка, як і дамаўляліся.**





caricatura.ru

---

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.092. Індэкс 63850. Зак. № 2483.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 23 чэрвеня 2015 года.